Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(73), 2012

*УДК 930(438)[36]”1919-1920”*

# Польская міжваенная гістарыяграфія аб усходняй палітыцы Польшчы ў час польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў

М.М. Мязга

У артыкуле выяўлены асноўныя напрамкі вывучэння ўсходняй палітыкі Польшчы ў перыяд польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў польскай гістарыяграфіяй міжваеннага перыяду. Устаноўлены тыя канцэпцыі і вывады, да якіх прыйшлі польскія даследчыкі па шэрагу пытанняў гісторыі польска-савецкай вайны і ўсходняй палітыкі Польшчы ў той перыяд. Паказана залежнасць развіцця гістарыяграфіі гісторыі польска-савецкай вайны ў міжваеннай Польшчы ад палітычнага фактара.
**Ключавыя словы:** Польшча, Савецкая Расія, польска-савецкая вайна, прычыны вайны, мірныя перамовы, інкарпарацыя, федэрацыя, тэрытарыяльнае пытанне, Рыжскі дагавор.

The article shows the main directions of study of the Eastern policy of Poland during the Polish-Soviet War of 1919–1920 by the Polish historiography of interwar period. Those conceptions and conclusions have been established that Polish research workers made due to the questions of the history of the Polish-Soviet war and the Eastern policy of Poland during that period. The dependence of historiography development of the Polish – Soviet war in interwar Poland on the political factor has been shown.
**Keywords:** Poland, Soviet Russia, Polish-Soviet War, causes of war, peace negotiations, incorporation, federation, territorial question, Riga agreement.

Польска-савецкая вайна 1919–1920 гадоў адыграла велізарную ролю ў фарміраванні межаў адрадзіўшайся Польшчы і наклала велізарны адбітак на яе міжнароднае становішча на працягу ўсяго міжваеннага перыяду. Таму цалкам лагічным з’яўляецца вялікая цікавасць польскай гістарыяграфіі да падзей гэтай вайны і тое, што яшчэ ў час вайны з’явіліся першыя работы польскіх аўтараў, прысвечаныя яе гісторыі. У дадзеным артыкуле мы ставім мэтай высветліць, якія важнейшыя канцэпцыі і падыходы былі распрацаваны польскімі гісторыкамі міжваеннага часу ў дачыненні да гісторыі ўсходняй палітыкі Польшчы ў час вайны 1919–1920 гадоў, якія пытанні ўказанай праблематыкі і ў якой ступені атрымалі асвятленне ў польскай міжваеннай гістарыяграфіі. Прадстаўляецца важным устанавіць, у якой ступені ідэйна-палітычны фактар паўплываў на фарміраванне ў міжваеннай Польшчы гістарыяграфіі польска-савецкай вайны.

Вельмі вострым і дыскусійным сярод даследчыкаў было пытанне аб прычынах узнікнення вайны. Польскія гісторыкі прызнавалі наяўнасць экспансіяніскіх планаў у Польшчы ва ўсходнім напрамку. Апраўдвалася гэта неабходнасцю стварэння “вялікай Польшчы”, якая змагла б выжыць у акружэнні Германіі і Расіі. В. Каліноўскі пісаў з гэтай нагоды яшчэ ў 1920 г., што палякі павінны “...стварыць уласную сілу, здольную адбіваць любыя напады з усходу і захаду” [1, s. 5]. Фактычна тую ж ідэю выказваў і С. Грабскі, які пісаў, што ў сілу свайго геаграфічнага становішча Польшча можа лічыцца незалежнай толькі тады, калі будзе сапраўды вялікай дзяржавай, гэта значыць сілай, з якой для кожнага суседа будзе карысна быць у добрых адносінах [2, s. 6]. Гэта азначала непазбежнае імкненне Польшчы выйсці за межы сваіх этнічных граніц.

Другі матыў экспансіі Польшчы на ўсход, які актыўна адстойвалі польскія даследчыкі, зводзіцца да выканання ёю ролі вызваліцеля зямель на ўсходзе ад бальшавізму. Л. Алендскі ў сваёй рабоце піша аб імкненні Польшчы прынесці на “ўсходнія крэсы” палітычныя і грамадзянскія свабоды, пазбавіць іх насельніцтва ад голаду [3, s. 13]. Думаецца, для польскіх правячых колаў галоўным матывам была не “вызваленчая місія” на беларускія і ўкраінскія землі, а імкненне адарваць іх ад Расіі і тым самым аслабіць яе, з чым пагаджаюцца і некаторыя сучасныя польскія гісторыкі [4, с. 28, 30]. Ніжэй мы ўбачым, што экспансіяніцкія планы Польшчы як фактар узнікнення вайны прызнавала і частка гісторыкаў міжваеннай Польшчы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

У калектыўнай працы польскіх даследчыкаў “Уваскрашэнне Польскай дзяржавы” адзначаецца, што пагроза для Польшчы перш за ўсё заключалася ў прапагандзе анархічных ідэй, якія зыходзілі з Расіі. Польшча імкнулася ад гэтай пагрозы адгарадзіцца, што і выклікала ваенны канфлікт [5, s. 208]. Буйны польскі публіцыст С. Строньскі запісаў у сваім дзённіку 7 ліпеня 1920 г. адносна прычын вайны, што Ленін у пачатку 1919 г. разлічваў дайсці да Цэнтральнай Еўропы “праз пагадненне са спартакаўцамі і з другімі палітыкамі ў Германіі, і з Бела Кунам у Венгрыі”. Змагаючыся з бальшавікамі, Польшча абаранялася сама і абараняла Захад ад “варварства” [6, s. 106–107].

Аб неабходнасці супрацьстаяць расійскай экспансіі як фактары, які падштурхоўваў Польшчу да вайны, піша і С. Кутжеба. На яго думку, Польшча павінна была выступіць у абарону польскага насельніцтва на тэрыторыі Віленшчыны і Заходняй Беларусі ад наступаўшых бальшавікоў [7, s. 162]. У выданні “Юзэф Пілсудскі. Стваральнік незалежнай Польскай дзяржавы” адзначалася ўсё тое ж імкненне Савецкай Расіі да распальвання сусветнай рэвалюцыі на Захадзе, дарога куды ляжала праз Польшчу, як прычына польска-савецкай вайны [8, s. 292]. У сучаснай гістарыяграфіі можна лічыць даказаным тэзіс аб імкненні Савецкай Расіі пасля пачатку Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі падштурхнуць сусветную рэвалюцыю прасоўваннем Чырвонай арміі на захад. Тут можна спаслацца на даследаванні аднаго з буйнейшых сучасных расійскіх спецыялістаў па гісторыі польска-савецкіх адносін М.І. Мельцюхова, які адзначаў, што савецкае кіраўніцтва распачало барацьбу за вяртанне Расіі ў клуб вялікіх дзяржаў і для дасягнення гэтай мэты ўзяло на ўзбраенне канцэпцыю сусветнай рэвалюцыі [9, с. 9].

На неабходнасць прадухіліць пагрозу “ўсеагульнай рэвалюцыі”, якую неслі рухаючыеся на захад савецкія войскі, як прычыну пачатку Польшчай ваенных дзеянняў указвае і В. Ліпіньскі. Ён жа гаворыць пра неабходнасць для палякаў даць адпор Чырвонай арміі, бо яны прывыклі лічыць, што з Расіі заўсёды ажыццяўляецца паход, каб прынесці Польшчы прыгнечанне [10, s. 136, 146]. Польская гістарыяграфія звязвае ў адно цэлае імкненне Савецкай Расіі ўтрымаць землі былой Расійскай імперыі з ажыццяўленнем сусветнай рэвалюцыі, прычым, перш чым развязаць яе ў Заходняй Еўропе, трэба было зрабіць рэвалюцыю ў Польшчы. Вынікам гэтых імкненняў “быў марш бальшавіцкіх войскаў на захад” [11, s. 45]. Такім чынам, у польскай гістарыяграфіі тэзіс аб неабходнасці супрацьстаяць пагрозе бальшавізму звязваецца ў адно цэлае з вынікаючай з гістарычнага вопыту неабходнасцю супрацьстаяць расійскай экспансіі незалежна ад грамадскага ладу Расіі.

У сярэдзіне 1930-х гадоў шырокае распаўсюджванне сярод польскіх гісторыкаў атрымала вылучэнне ў якасці прычыны ўзнікнення вайны з Савецкай Расіяй імкнення Польшчы адарваць ад Расіі заходнія землі, каб аслабіць яе. У выданні “Юзеф Пілсудскі. Стваральнік незалежнай Польскай дзяржавы” адзначаецца імкненне Пілсудскага адсунуць польскую граніцу як можна далей на ўсход [8, s. 292]. Ю. Лукасевіч адзначае, што польскі народ з моманту аднаўлення сваёй незалежнасці адразу пачаў барацьбу за вяртанне да граніц Рэчы Паспалітай. Ён указвае, што і мэтай паходу на Кіеў у 1920 г. было імкненне Пілсудскага атрымаць выгадныя для Польшчы граніцы і забяспечыць яе бяспеку праз стварэнне незалежнай Украінскай дзяржавы [12, s. 12, 17]. Даступныя нам дакументы, як напрыклад, нота Р. Дмоўскага старшыні камісіі па польскіх справах Ж. Камбону ад 25 лютага 1919 г., не пакідаюць сумнення ў тым, што кіруючыя колы адроджанай Польшчы ставілі сваёй мэтай далучэнне да яе большай часткі Беларусі [13, с. 228].

Польская гістарыяграфія таксама звяртаецца да даследавання спроб мірнага ўрэгулявання паміж Расіяй і Польшчай у 1919 – пачатку 1920 г. Г. Свобада адзначае імкненне Савецкай Расіі да перамоў ва ўказаны час [14, s. 67]. С. Кутжэба прызнае, што ініцыятыва мірных перамоў зыходзіла з савецкага боку. Ён указвае, што і большасць польскіх палітычных дзеячаў выступала ў той момант за заключэнне міру. Але Савецкая Расія, як лічыць С. Кутжэба, не імкнулася да дасягнення міру. Яна хацела задаволіць свае інтарэсы шляхам ваенных дзеянняў, аб чым сведчыць падрыхтоўка наступлення на Дзвіне. Наступленне Пілсудскага на Кіеў падаецца як польскі адказ на пагрозу савецкага наступлення [7, s. 171–172]. Польскімі даследчыкамі таксама адзначаецца, што ў мірных прапановах Савецкай Расіі Пілсудскі ўба-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

чыў толькі спробу бальшавікоў выйграць час, каб лепш падрыхтавацца да працягу вайны [15, s. 148]. Той жа тэзіс гучыць і ў рабоце "Гісторыя Польшчы. Эпоха Маршала Пілсудскага", дзе сказана, што мірныя прапановы бальшавікоў у снежні 1919 г. былі ходам, накіраваным на тое, каб выйграць час і сканцэнтраваць як можна больш войскаў для наступлення на Польшчу [16, s. 47]. Нам прадстаўляецца, што ў пачатку 1920 г. Савецкая Расія сапраўды гатова была пайсці на заключэнне мірнага дагавора з Польшчай праз значныя тэрытарыяльныя саступкі. І гэта разглядалася бальшавікамі сапраўды як выйгрыш часу, толькі не ў плане бягучага моманту, звязнага з лепшай падрыхтоўкай да ваенных дзеянняў, а ў кантэксце дактрыны сусветнай рэвалюцыі. Тут можна спаслацца на ўспаміны Ю. Мархлеўскага, які пісаў, што пасля перамогі над Калчаком і Дзянікіным дадзеныя яму для перамоў з палякамі інструкцыі аб значных тэрытарыяльных саступках Польшчы не змяніліся [17, с. 15]. Пазіцыю савецкага кіраўніцтва па пытанню тэрытарыяльных саступак Польшчы даволі дакладна растлумачыў К. Радэк. Выступаючы 5 мая 1920 г. на сходзе агітатараў Маскоўскай арганізацыі РКП (б), ён заявіў: "Гэта мы рабілі таму, што ведалі, што ў Польшчы нарастае рэвалюцыя рабочых і што ў Польшчы, можа быць праз паўгода ці год, рабочыя возьмуць уладу і вызваляць сялян Літвы і Беларусі" [18, с. 14].

Частка польскіх даследчыкаў бачыла мэту бальшавікоў у тым, каб праз перамовы з Польшчай стварыць важны міжнародны прэцэдэнт для перамоў з іншымі дзяржавамі, што азначала б фактычнае прызнанне савецкага ўрада. Акрамя таго, бальшавікі, у выпадку адмовы Польшчы ад перамоў, маглі разгарнуць прапагандысцкую кампанію па выкрыццю яе імперыялістычнай палітыкі. Савецкія прапановы, адзначаюць польскія гісторыкі і публіцысты, былі непрымальныя для Польшчы і з ваеннага пункту гледжання, бо перамір'е па ўсім фронце, якога бальшавікі дабіваліся вясной 1920 г., магло быць выкарыстана для перагрупіроўкі савецкіх войскаў і падрыхтоўкі да ваенных дзеянняў [19, s. 95–96, 97]. Неабходна адзначыць, што ў польскай гістарыяграфіі прызнаецца гатоўнасць Савецкай Расіі ў канцы 1919 – пачатку 1920 г. весці перамовы на выгадных для Польшчы ўмовах. Я. Чэканоўскі адзначае гатоўнасць бальшавікоў правесці польска-савецкую граніцу па Бярэзіне [20, s. 65].

Частка польскіх даследчыкаў і публіцыстаў ставіць пад сумненне бальшавіцкую пагрозу для Польшчы ў пачатку 1920 г. На думку Р. Дмоўскага, тое, што бальшавікі летам 1920 г. апынуліся пад Варшавай, было вынікам паходу, які меў на мэце аддзяленне Украіны ад Расіі [21, s. 235]. В. Сікорскі таксама гаворыць пра адсутнасць расійскай пагрозы для Польшчы ў 1920 г. Ён звязвае гэта са слабасцю расійскай арміі, якая была слаба ўзброена навейшымі сродкамі вядзення вайны і мела "не самыя лепшыя ўнцэрафіцэрскія кадры і не заўсёды падрыхтаваных да вядзення вайны вышэйшых камандзіраў" [22, s. 213–214].

Звяртаючыся да пытання аднаўлення ваенных дзеянняў вясной 1920 г., С. Кутжэба адзначае ў якасці прычыны няўдачы мірных перамоў імкненне Пілсудскага праз паход на Кіеў аддзяліць Украіну ад Расіі, дапамагчы Пятлюры стварыць незалежную Украінскую дзяржаву ў абмен на адмову Украіны ад прэтэнзій на Усходнюю Галіцыю і частку Валыні [23, s. 173]. Аўтары працы "Вызваленая Польшча" ўказваюць, што імкненне Пілсудскага да стварэння незалежнай Украінскай дзяржавы абумовіла польскае наступленне на Паўднёва-Усходнім фронце [19, s. 98]. Той жа тэзіс гучыць і ў рабоце Г. Свабоды, які адзначае, што паход на Кіеў быў выкліканы імкненнем Пілсудскага рэалізаваць пэўную палітычную канцэпцыю [14, s. 69]. На думку А. Вернага, спробы мірнага ўрэгулявання закончыліся няўдачай, бо ў Польшчы ў той момант перамагла федэралісцкая канцэпцыя палітыкі ў дачыненні да Украіны і Беларусі. Галоўнай палітычнай мэтай Пілсудскага стала стварэнне незалежнай Украінскай дзяржавы, што прывяло да паходу на Кіеў [24, s. 111].

В. Лапіньскі лічыць, што зрыву спроб мірнага ўрэгулявання і аднаўленню вайны вясной 1920 г. садзейнічала палітыка абодвух бакоў. З аднаго боку, да гэтага прывяло імкненне Пілсудскага правесці наступленне, каб стварыць "незалежную Украіну", з другога – Савецкая Расія сама планавала наступленне супраць Польшчы, каб разбіць яе і "раздзьмуць пажар камуністычнай рэвалюцыі ва ўсёй Еўропе" [10, s. 156–157]. Сапраўды, сучасныя даследаванні паказваюць, што вясной 1920 г., як бальшавікі, так і Пілсудскі, не адвяргаючы адкрыта ідэю перамоў, вялі падрыхтоўку да наступальных дзеянняў на фронце. Савецкае камандаван-

не свой план наступлення супраць Польшчы пачало распрацоўваць са студзеня, а Пілсудскі яшчэ 26 лютага выдаў загад аб пачатку Мазырскай аперацыі польскай арміі [25, с. 358, 362].

Польскія даследчыкі ўказваюць, што імкненне падштурхнуць сусветную рэвалюцыю з дапамогай Чырвонай арміі стала важным фактарам савецкай палітыкі ў дачыненні да Польшчы ў 1920 г. В. Жымоўскі адзначаў, што бальшавікі ішлі на Варшаву, каб на “развалінах польскай дзяржавы ўтварыць агульную граніцу з Германіяй” [26, s. 36]. У рабоце “Юзэф Пілсудскі. Стваральнік незалежнай Польскай дзяржавы” гаворыцца, што бальшавікі неслі знішчэнне не толькі Польшчы, але і ўсёй Еўропе. Пілсудскі сваім паходам на Кіеў проста іх апярэдзіў [8, s. 297, 294]. Польшчу польскія гісторыкі прадстаўляюць як краіну, якая выратавала Еўропу ад бальшавіцкай рэвалюцыі. Ю. Лукасевіч пісаў у гэтай сувязі: “...паражэнне Польшчы пагражала бальшавіцкай рэвалюцыяй усёй Еўропе” [12, s. 19]. А. Верны таксама адзначае імкненне бальшавікоў з дапамогай Чырвонай арміі прынесці ў Польшчу сацыялістычную рэвалюцыю. Разам з бальшавіцкімі войскамі ўжо знаходзіўся “ўрад Польскай рэспублікі” [24, s. 115]. Сёння на аснове вядомых даследчыкам дакументаў мы адназначна можам зрабіць вывад аб імкненні савецкага кіраўніцтва летам 1920 г. з дапамогай Чырвонай арміі ажыццявіць экспарт рэвалюцыі, аб чым польская гістарыяграфія абгрунтавана заявіла яшчэ ў 1920-я – 1930-я гады. Для прыкладу спашлёмся толькі на прамову Леніна 6 лістапада 1920 г., у якой ён заявіў: “Наша стаўка была стаўкай на міжнародную рэвалюцыю...” [27, с. 2].

У міжваенны час у польскай гістарыяграфіі з’явілася серыя прац, прысвечаных ходу вайны 1919–1920 гадоў, многія з якіх былі напісаны непасрэднымі ўдзельнікамі падзей. В. Сікорскі ў сваіх даследаваннях адзначае, што заходні фронт у 1919 г. меў для бальшавікоў другараднае значэнне, пакуль яны змагаліся з Калчаком і Дзянікіным [22, s. 232]. А. Верны пісаў, што Расія доўгі час не надавала значэння польскай вайне за крэсы і саступала амаль без бою [24, s. 107]. Гэтым і тлумачацца поспехі польскай арміі ў 1919 г. Ход вайны ў 1920 г. у першы пасляваенны час найбольш поўнае асвятленне атрымаў у працах Ю. Пілсудскага. Ён адзначаў, што ў выніку перамогі ў бітве на Вісле “бальшавіцкая армія была поўнасцю разбіта, і польская армія мела магчымасць практычна бесперашкодна прасоўвацца далёка наперад. Але ў польскага грамадства для гэтага не хапіла маральных сіл” [28, s. 124]. Сярод польскіх даследчыкаў меў распаўсюджанне тэзіс аб памылковасці кіеўскага паходу польскіх войскаў вясной 1920 г. В. Сікорскі гэты паход характарызуе як стратэгічную памылку, бо ён не дазволіў разбіць галоўныя сілы Чырвонай арміі [22, s. 234]. А. Верны таксама лічыць паход Пілсудскага на Кіеў вясной 1920 г. палітычнай і ваеннай памылкай. Галоўныя сілы Чырвонай арміі былі сканцэнтраваны на Беларусі, а асноўныя намаганні польскай арміі былі сканцэнтраваны на Украіне. Але нават тут войскі Чырвонай арміі не былі разгромлены, “а змаглі беспакарана адступіць” [24, s. 112]. Сапраўды, як паказваюць сучасныя даследаванні, перамогу Пілсудскага на Украіне нельга назваць пераканаўчай, асноўныя сілы Чырвонай арміі пазбеглі разгрому [25, с. 380]. У 1930-я гады ў польскай гістарыяграфіі ўсё больш шырока ўкараняецца тэзіс, што перамогай на Вісле Польшча абавязана перш за ўсё Ю. Пілсудскаму [8, s. 301–302].

Дастаткова шмат увагі польскія даследчыкі звярнулі на характар адносін кіраўніцтва Польшчы да беларускага і ўкраінскага нацыянальных рухаў. Перш за ўсё яны імкнуліся даказаць, што палітыка Польшчы ў дачыненні да Беларусі і Украіны не была імперыялістычнай. Пры гэтым яны спасылаюцца на віленскую заяву Пілсудскага ад 22 красавіка 1919 г., сцвярджаючы, што ў ёй начальнік дзяржавы абвясціў права народаў ВКЛ самастойна вырашаць свой лёс і прадставіў ім для гэтага ўсе магчымасці [19, s. 84]. Польскія гісторыкі і публіцысты даказваюць, што ўрад Польшчы імкнуўся аказаць падтрымку беларускаму нацыянальнаму адраджэнню. У прыватнасці, у выданні “Вызваленая Польшча” сцвярджаецца, што вясной 1920 г. Польшча “вяла вайну не толькі за свае ўласныя інтарэсы, але і імкнулася дапамагчы беларускаму насельніцтву, якое стагнала пад крывавым ярмом бальшавіцкай няволі” [19, s. 98]. Наўрад ці гэты тэзіс польскіх даследчыкаў з’яўляецца дастаткова абгрунтаваным. У пачатку 1920 г. Ю. Пілсудскі заявіў Л. Васілеўскаму, што “Беларусь яшчэ зусім не гатова, і ў дадзены момант празмерна вострае выступленне з беларускім пытаннем было б кампраметацыяй іншых, больш сур’ёзных пытанняў” [29, с. 31].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

Прычыну таго, што ідэя беларускай дзяржаўнасці не была рэалізавана, польскія даследчыкі бачаць перш за ўсё ў слабасці беларускага нацыянальнага руху. С. Кутжэба адзначае слабасць беларускага нацыянальнага руху і нацыянальнай свядомасці беларусаў, што не дазволіла стварыць неабходнае асяроддзе для рэалізацыі ідэі федэрацыі [22, s. 167]. Л. Васілеўскі адзначаў, што ў час польска-савецкай вайны беларусы не былі ў стане стварыць сілу, здольную рэалізаваць ідэю незалежнасці [30, s. 394]. У іншых сваіх працах Л. Васілеўскі развівае гэтую думку. Ён пісаў, што Ю. Пілсудскі ў сваёй беларускай палітыцы зыходзіў з таго, што беларускі нацыянальны рух вельмі слабы. Таму пакуль трэба было стварыць “беларускі П’емонт у Польшчы”, які стаў бы цэнтрам росту беларускага нацыянальнага руху. У той жа час Пілсудскі лічыў магчымым дапамагчы Пятлюры, бо ўкраінскі нацыянальны рух, на яго думку, быў больш моцным. Пілсудскі, па словах Васілеўскага, гатовы быў прадставіць беларусам магчымасці для развіцця культуры, але быў катэгарычна супраць прызнання ўрада БНР [31, s. 216, 218]. Некаторымі міжваеннымі гісторыкамі прызнаецца, што і Польшча ў сваёй палітыцы далёка не заўсёды гатова была адстойваць інтарэсы беларусаў і ўкраінцаў у справе стварэння нацыянальнай дзяржавы. В. Каліноўскі ўказваў, што тагачасны польскі ўрад не прызнаваў работы беларусаў па стварэнню сваёй дзяржавы, і ў гэтым ён “зліваецца з вялікаросамі”. На яго думку, польская палітыка на Беларусі вызначалася альтэрнатывай: Масква ці Польшча. Гэта была канцэпцыя Р. Дмоўскага, якая прадугледжвала падзел Беларусі на польскую і рускую. В. Каліноўскі лічыць, што Польшча павінна была падтрымаць рэалізацыю нацыянальных інтарэсаў беларусаў, але зрабіць гэта трэба не дзеля іх саміх, а для аслаблення Расіі. Ён пісаў, што “Расія без Балтыкі, без Беларусі, без Украіны не палохае нікога” [1, s. 11, 12, 14].

Важнае месца ў польскай гістарыяграфіі займала праблема падпісання Рыжскага дагавора. Польскія аўтары адзначалі, што ў пачатку мірных перамоў савецкі ўрад высунуў вельмі цяжкія для Польшчы ўмовы, такія, якія можна было б вылучыць у выпадку ўзяцця Варшавы. Далей у ходзе перамоў сітуацыя змянілася. Савецкі бок гатоў быў ісці на вялікія тэрытарыяльныя саступкі. Але польская дэлегацыя на перагаворах у Рызе прытрымлівалася таго пункту гледжання, што Польшча павінна далучыць толькі тыя землі, якія былі моцна паланізаваныя. У сувязі з гэтым палякі адмовіліся ад Мінска [15, s. 174, 178]. Увогуле, польскія даследчыкі вызначаюць у якасці галоўнага пытання на мірных перамовах менавіта тэрытарыяльнае пытанне. Яны адзначаюць наяўнасць у польскай дэлегацыі ў Рызе прыхільнікаў як канцэпцыі інкарпарацыі, так і канцэпцыі федэрацыі. Першая з іх, па словах Г. Свободы, “задавальнялася меншымі тэрыторыямі, але ўжо для самой Польшчы” [14, s. 81]. Звяртаючыя да гэтай праблемы, удзельнік рыжскіх перамоў С. Грабскі адзначаў, што ў іх час ён адстойваў пункт гледжання, згодна якому да Польшчы на ўсходзе трэба было далучыць такія тэрыторыі, на якіх за непрацяглы час магла ўтварыцца выразная польская большасць. Тлумачачы, чаму палякі адмовіліся ад Мінска, С. Грабскі пісаў, што калі б да Польшчы быў далучаны Мінск і граніца была б адсунута далей на ўсход, то ў Польшчы ўзнікла б беларускае пытанне, не менш небяспечнае, чым украінскае [32, s. 70, 72].

Па словах Грабскага, у польскай дэлегацыі не было ні аднаго чалавека, які думаў бы аб тым, каб граніца прайшла па Дняпру. Імкненне да лініі Дняпра азначала б працяг вайны, а за зіму бальшавікі маглі стварыць армію, значна пераўзыходзячую па колькасці польскую. С. Грабскі лічыў, што значна больш важна, чым дасягнуць лініі Дняпра, для Польшчы было дабіцца агульнай граніцы з Латвіяй, каб аддзяліць Расію ад Літвы. На думку С. Грабскага, польская дэлегацыя стаяла перад альтэрнатывай: Камянец, Праскураў і Мінск ці Дзясна і Вілейка. Выбар быў зроблены ў бок апошняга варыянта [2, s. 105]. У сваіх даследаваннях С. Кутжэба выказвае пункт гледжання, што на перамовах у Рызе стала відавочна, што граніца пройдзе непасрэдна з Расіяй і граніцу неабходна правесці так, “каб яна не была прадметам спрэчкі цяпер і ў будучым” [33, s. 51].

Згодна канцэпцыі польскіх даследчыкаў, польская дэлегацыя ў Рызе пры вызначэнні ўсходняй граніцы Польшчы кіравалася трыма аргументамі. Першы аргумент – ваенна-стратэгічны. Ён заключаўся ў імкненні максімальна адсунуць граніцу ад сталіцы і ўключыць у склад Польшчы чыгуначную лінію Сарны – Броды – Баранавічы – Маладзечна. Другі аргу-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мент, палітычны, патрабаваў максімальнага павелічэння тэрыторыі і насельніцтва Польшчы, каб тым самым дабіцца ператварэння Польшчы ў вялікую дзяржаву. Трэці аргумент – нацыянальны. Згодна яму, Польшча павінна была выратаваць польскую нацыянальную меншасць на тэрыторыі "ўсходніх крэсаў" [19, s. 113]. У выніку рэалізацыі гэтых планаў, як падкрэсліваў Я. Чаканоўскі, Польшча па Рыжскаму дагавору не дасягнула граніцы 1772 г., але значна выйшла за межы, дзе польскае насельніцтва складала большасць [20, s. 15–16].

Такім чынам, у якасці важнейшых праблем у гісторыі ўсходняй палітыкі Польшчы часоў польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў, вывучэнню якіх польская міжваенная гістарыяграфія надала найбольш увагі, можна вылучыць прычыны ўзнікнення вайны і яе аднаўлення ў 1920 г., яе ход, спробы мірнага ўрэгулявання ў канцы 1919 – вясной 1920 гадоў, ход мірных перамоў у Мінску і Рызе. Трэба сказаць, што на вывучэнне ўказаных праблем вялікі ўплыў аказваў ідэйна-палітычны фактар. Так, пры вызначэнні прычын узнікнення вайны польскія гісторыкі імкнуліся віну за гэта ўсклaсці на Савецкую Расію, якая, па іх меркаванню, ажыццяўляла імперыялістычную палітыку, выкарыстоўваючы для гэтага канцэпцыю сусветнай рэвалюцыі. Многія польскія гісторыкі і публіцысты прызнавалі наяўнасць экспансіянісцкіх мэтаў і ў польскай усходняй палітыцы, але апраўдвалі іх неабходнасцю стварыць "вялікую Польшчу", якая толькі і можа выжыць у акружэнні Германіі і Расіі, а таксама "гістарычнымі правамі" Польшчы на "ўсходнія крэсы". Пры разглядзе пытання аб спробах мірнага ўрэгулявання ў канцы 1919 – пачатку 1920 г. польскія гісторыкі, некалькі спрошчана, трактуюць савецкую пазіцыю як спробу выйграць час. Пры гэтым прызнаецца, што зрыву перамоў садзейнічала і пазіцыя Пілсудскага, які планаваў паход на Кіеў, адзначаецца, што Савецкая Расія прапаноўвала Польшчы вельмі выгадныя ўмовы. Польскія гісторыкі і публіцысты нізка ацанілі магчымасці беларускага нацыянальнага руху ў справе стварэння Беларускай дзяржавы і як саюзніка Польшчы ў барацьбе супраць Расіі. Пры разглядзе савецка-польскіх мірных перамоў у Рызе польскія даследчыкі справядліва ўказалі, што галоўным на іх было тэрытарыяльнае пытанне, і паказалі гатоўнасць Савецкай Расіі ісці па гэтым пытанні на вялікія саступкі. У польскай дэлегацыі галоўную ролю пры вызначэнні граніцы адыграла пазіцыя С. Грабскага.

## Літаратура


1. Kalinowski, W. Kwestja wschodnia a Białorus / W. Kalinowski. – Warszawa, 1920. – 18 s.
2. Grabski, S. Z zagadnień polityki narodowo-państwowej / S. Grabski. – Warszawa : Perzynski, Niklewicz i s-ka, 1925. – 134 s.
3. Olęndzki, K. Kresy wshodnie a Polska / K. Olęndzki. – Warszawa, 1919. – 16 s.
4. Гомулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фармаванняў (1918–1922) / К. Гомулка. – Вільня, 2008. – 256 с.
5. Wskzreczenie Państwa Polskiego. Szkic historyczny : w 2 t. T. 1. – Krakow, 1920. – 240 s.
6. Stroński, S. Pierwsze lat dziesięć (1918–1928) / S. Stroński. – Lwow – Warszawa : Gabrynowicz i syn, 1928. – 628 s.
7. Kutrzeba, S. Polska Odrodzona 1914–1921 / S. Kutrzeba. – Krakow : Gebethner i Wolff, 1921. – 230 s.
8. Jòzef Pilsudski. Tworca nipodległego państwa Polskiego. Zarys życia dzialalności. Opracowal Henryk Cepnik. – Warszawa : Instytut propagandy panstwowo-tworczej, 1934. – 327 s.
9. Мельтюхов, М.И. 17 сентября 1939. Советско-польские конфликты 1918–1939 / М.И. Мельтюхов. – М. : «Вече», 2009. – 624 с.
10. Lipiński, W. Wielki Marszałek (1867–1835) / W. Lipiński – Warszawa : Naklad Gebethnera i Wolffa, 1936. – 226 s.
11. Historia Polski. Epoka Marchałka Piłsudskiego. – Grudziądz : Druk. Remeslniczej, 1935. – 60 s.
12. Łukasiewicz, J. Polska jest mocarstwem / J. Łukasiewicz. – Warszawa : Nakład Gebethnera i Wolffa, 1939. – 64 s.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

13. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1918–1920 гг.) : зб. дакументаў і матэрыялаў : у 4 т. Т. 1. Ч. 1. – Мінск : «Юніпак», 2008. – 540 с.
14. Swoboda, H. Pierwsze piętnastolecie Polski niepodleglej (1918–1933) / H. Swoboda. – Warszawa : Wyd. «Rabotnik», 1933. – 436 s.
15. Wskreszenie Panstwa Polskiego. Szkic historyczny : w 2 t. T. 2. 1918–1923. – Krakow : Krakowska Supolka Wydawnicza, 1925. – 300 s.
16. Historia Polski. Epoka Marchałka Piłsudskiego. – Grudziądz : Druk. Remeslniczej, 1935. – 60 s.
17. Мархлевский, Ю. Война и мир между буржуазной Польшей и пролетарской Россией / Ю. Мархлевский. – М. : Гос. издат., 1921. – 44 с.
18. Радек, К. Война польских белогвардейцев против Советской России (Доклад на собрании агитаторов Московской организации РКП(б) 8 мая 1920 г.) / К. Радек. – М. : Гос. издат., 1920. – 24 с.
19. Polska wyzwołona. 1918–1933. – Warszawa, 1933. – 245 s.
20. Czekanowski, J. Wschodni zagadnienia graniczne Polski i stosunki etniczno-społeczne / J. Czekanowski. – Lwow, 1921. – 144 s.
21. Dmowski, R. Swiat powojenny i Polska / R. Dmowski. – Warszawa : Druk. F. Wyszyński i s-ka, 1931. – 384 s.
22. Sikorski, W. Nad Wisła i Wkra / W. Sikorski. – Lwow – Warszawa – Krakow : Wyd. Zakladu narodowego im Ossolińskich, 1928. – 276 s.
23. Kutrzeba, S. Polska Odrodzona 1914–1922 / S. Kutrzeba. – Krakow : Gebethner i Wolff, 1922. – 264 s.
24. Werny, A. Na szlahach dziejowych Romana Dmowskiego / A. Werny. – Warszawa, 1939. – 136 s.
25. Грицкевич, А.П. Борьба за Украину / А.П. Грицкевич. – Минск : Современная школа, 2011. – 528 с.
26. Rzymowski, W. Roman Dmowski czciciel djabła / W. Rzymowski. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1932. – 58 s.
27. Ленин, В.И. Речь на торжественном заседании Пленума Московского совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов, МК РКП (б), МГСПС, посвященном 3-ей годовщине октябрьской революции 6 ноября 1920 г. // Полное собрание сочинений. – Т. 42. – С. 1–6.
28. Piłsudski, J. Problema Wilenska / J. Piłsudski // Pisma zbiorowe / J. Piłsudski : w 8 t. T. 6. – Warszawa : Instytut J. Pilsudskiego, 1937. – S. 120–124.
29. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зб. дакументаў і матэрыялаў : у 4 т. Т. 1. Ч. 2. – Мінск : «Юніпак», 2008. – 394 с.
30. Wasilewski, L. Białoruś i ruch białoruski / L. Wasilewski // Przegląd Wspòlczesny. – 1920. – № 9.
31. Wasilewski, L. Jòzef Pilsudski: Jakim Go znałem / L. Wasilewski. – Warszawa : Wyd. “Roj”, 1935. – 236 s.
32. Grabski, S. Uwagi o bieżocej historycznej chwili Poski / S. Grabski. – Warszawa : Wyd. Perzynski, Niklewicz и s-ka, 1922. – 160 s.
33. Kutrzeba, S. Nasza polityka zagraniczna / S. Kutrzeba. – Krakow : Druk. “Głos Narodu”, 1923. – 122 s.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 14.03.12

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины